Народны Звон

Беларуская радыкальная часопісь. Орган „Цэнтрасаюзу“.

Цана асобнага нумару 20 гр.

Адрэс Радакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Вострабрамская 9, кв. 22

Прыймо інтэрэсантаў ад 10 да 2 гадз. што-дня, апрача сьвятаў і нядзель.

Падпіска з дастаўкай да хаты: на 1 год—6 зл., за паўгоду — 3 зл., за 3 мес. — 2 зл., за 1 мес.—50 гр.

Год I. Вільня, 9 сьнежня 1930 г. № 6

Як узмоцніць сваю грамадзкасьць.

Апошнія выбары ў Сойм і наагул усё грамадзкае жыцьцё беларусаў пад Польшчаю—павінны кожнага сьвядомага беларуса затрымаць над пытаньнем — што рабіць, каб узмоцніць нашу грамадзкасьць і зрабіць яе больш адпорнаю проці ўсялякіх спробаў, маючых дэнацыяналізуючы характар, з якога-б боку яны ня ішлі, і ўносячых у наш народ элементы разлажэньня і маральнай гнілі.

Да гэтага часу некаторымі грамадзкімі дзейнікамі вельмі многа ўдзялялася ўвагі на пытаньня міравой палітыкі, якая ўбівалася ў галавы нашага сялянства ў вельмі ўпрошчаным і вульгарным відзе,—што ў сваю чаргу мела зусім некарысныя для ўсёй беларускай справы вынікі.

Дзякуючы захопленьню значнай часткі нашага грамадзянства пытаньнямі „высокай палітыкі“, мы занядбалі штодзенную нашу працу і апынуліся перад тым, перад чым мы стаімо ў сучасны мамэнт.

Многае, вельмі карыснае для нашай справы, можна было-б зрабіць нават і пры сучасных палітычных умовах жыцьця, але яно ня робіцца — і ня робіцца толькі таму, што мы адвыклі ад малых справаў. Мы ня маем газэт, а калі якая і выходзіць, то выходзіць вельмі неакуратна, а часам бывае і так, што няма чаго ў ёй і чытаць.

Чаму гэта так? Дзе прычына гэтага сумнага зьявішча? Чаму гэта народ, які лічыць у межах Польшчы панад 2 мільёны галоў, які мае сваю пекную гісторыю, ня мае ць таго, што маюць іншыя народы, знаходзячыяся прыблізна ў аднолькавых з намі ўмовах жыцьця?

Толькі таму, што наша грамадзкасьць, дзякуючы розным прычынам, знаходзіцца ў прымітыўным стане.

Толькі таму, што самаю будовою гэтай грамадзкасьці ніхто сур'ёзна не займаўся, а калі хто і бавіўся ў яе—дык меў нейкія заднія мэты, нічога супольнага ня маючыя з дабром нашага народу.

Наш народ сыстэматычна карміўся дармовыю рассылкаю газэтаў, што прывяло да таго, што наагул беларускі чытач прывык не плаціць за сваю беларускую газэту, лічучы, што нехта павінен задарма, як манну нябесную, высылаць яму ўсе беларускія друкі.

Ні для каго ня сэкрэт, што справы нашых выдавецтваў стаяць найгорай у параўнаньні з усімі іншымі народамі, якія жывуць у межах Польшчы.

І вось з гэтым ліхам трэба пачаць барацьбу „да пабеднага канца“.

Трэба пачаць з узгадаваньня нашага чытача. Трэба навучыць яго, каб шанаваў сваё друкаванае слова, а вонкавым выразам гэтай пашаны мае быць аплата яго, хацяж-бы па сабевартасьці.

Бяз асягненьня гэтага мы ня зможам зрабіць аніводнага кроку наперад. Трэба, каб сама правіцыя ўзялася за гэтую справу, рабіла складкі і выпісвала на агульны кошт беларускія часопісі і газэты. Тады толькі будзе магчымасьць палепшыць іх і задаволіць усе духовыя патрэбы нашага чытача.

Стварыўшы сваю прэсу, якая зьвязала-б моцнымі ніцямі ўсё нашае грамадзянства — мы гэтым вельмі многа зрабілі-б для ўсёй нашай справы.

Памятайма, што

сьнежань ёсьць месяц нашай прэсы

Усе, як адзін, павінны ўнесьці падпісную плату, запранумараваўшы газэту на 1931 год.

Але гэта трэба зрабіць. Ініцыятыва ў гэтай справе залежыць ад нашых „нізоў“, якім бязумоўна ўсе справы, зьвязаныя з нашым адраджэньнем, павінны быць блізкімі.

Далей, у многіх выпадках ёсьць магчымасьці адчыняць бібліатэкі-чытальні. Праўда, даецца зрабіць гэта з вялікімі труднасьцямі, але ўсё-ж такі з пэўнымі высілкамі можна дабіцца свайго.

Аднак толькі адчыніць бібліатэку, вывясіць шыльд і далей нічога не рабіць і нават ня чытаць тых кніжак, якія знаходзяцца ў чытальні—гэта ўсё роўна, што й нічога не зрабіць. Трэба дбаць пра сваю бібліотэку. У некаторых выпадках зусім магчыма атрымаць ад самаўрадаў, дзе ёсьць радныя беларусы, дапамогі на расшырэньне бібліотэк і чытальняў.

Калі-б і гэта не ўдалося, можна шукаць і іншых шляхоў: зьбіраць ахвяры, старыя кнігі, ладзіць вечарыны і г. д. Словам, і тут можна даць раду, калі толькі была-б энэргія і ахвота папрацаваць для грамадзкай справы.

Зусім іначай выглядала-б наша Беларусь, каб яна пакрылася густою сеткаю бібліотэк і чытальняў, дзе кожны ў свабодную мінуту мог-бы знайсьці свой родны куток.

А ці-ж ня варта было-б навучыцца ў іншых народаў, хаця-ж бы таму, як адчыняць і як вясьці коопэратыў, каб пазбавіцца бязбожнай экспляатацыі. Ці-ж ня прынясьлі-бы карысьці нашаму сялянству такія арганізацыі, як крэдытнае таварыства, які-небудзь малочны коопэратыў і г. д.

Усё гэта добрыя рэчы і кожны з гэтым пагодзіцца, але на жаль, справа гэта стаіць у нас на мёртвым пункце і ніяк ня можа зрушыцца з мейсца.

Усе чакаем „манны нябеснай“, каб нехта прыйшоў і зрабіў за нас тое, што павінны зрабіць мы самі, сваімі ўласнымі высілкамі.

Каб нават асягнуць тое, што накрэсьлена вышэй, трэба палажыць шмат часу і высілкаў, бо ў нас абсалютна нічога ня зроблена ў гэтым кірунку.

Калі мы запраўды залічаем сябе да сьвядомага грамадзянства — то павінны безадкладна прыступіць да гэтай штодзеннай працы.

Праўда, што яна ня так „эфэктоўная“, як тая, якая зьвязана з „вышэйшаю палітыкаю“, але затое, на нашу думку, яна можа прынясьці куды больш карысьці...

Прачытаўшы газэту — перадай другому.

Арышты беларускіх дзеячоў у Савецкай Беларусі.

У польскай і загранічнай прэсе пішуць пра арышты вядомых беларускіх дзеячоў.

Арыштаваны наступныя грамадзяне: б. прэм'ер Народнай Белар. Рэспублікі Цьвікевіч, Ластоўскі, Смоліч, Краскоўскі, Лёсік, Некрашэвіч, б. Камісар земляробства—Прышчэпаў, Адамовіч—сябра Кампартыі, прафэсар Горы Горскай Акадэміі Гарэцкі, Іван Савіцкі і шмат інш.

Імкнучыся да зьнішчэньня беларускай культуры камуністычная ўлада пасадзіла за вастрожныя краты беларускіх пісьменьнікаў: Дудара, М. Зарэцкага, Лужаніна і Пушчу.

У „Зьвезьдзе“ воргане Цэнтральнага Камітэту Беларускай Камуністычнай Партыі, у востры спосаб атакуюць вышэйпададзеных грамадзян, якія быццам прызналіся да сваёй „контр-рэвалюцыйнай“ дзеяльнасьці.

Бязумоўна, уся „віна“ гэтых арыштаваных, якім грозіць самая цяжкая кара, заключалася толькі ў тым, што былі беларусамі і працавалі на карысьць сваёй бацькаўшчыны.

У зьвязку з тым, што арыштавана шмат беларускіх пісьменьнікаў —адгукнулася некая „асацыяцыя пралетарскіх пісьменьнікаў“, дамагаючыся ў сваім пратэсьце для арыштаваных кары сьмерці.

Пратэст гэты падпісаны праз такіх „пісьменьнікаў“ — як Юдэльсон, Бронштэйн, Пфляумбаум, Вітэнзон, Ліфшыц і іншых з „міравых сьвяціл“.

На мітынгах зарганізаваных праз камуністаў выносяцца рэзалюцыі, дамагаючыся расстрэлу арыштаваных.

Афіцыяльны савецкі камунікат аб арыштах беларускіх дзеячоў.

Пададныя праз польскую прэсу і нашу газэту весткі аб арыштах выдатных беларускіх дзеячоў зусім правільныя.

Гэтых арыштаў ня можа скрыць і афіцыяльная савецкая прэса, асьвятляючы толькі гэты факт па свойму.

У Маскоўскай газэце „Праўда“ ад 2 сьнежня г. г. надрукавана наступнае:

„Менск 30 лістапада (ТАСС). ГПУ Беларусі арыштавана контр-рэвалюцыйная інтэлігенская група нацыянал-дэмакратаў, складаючаяся у пераважнай большасьці з быўшых эсэраў і белагвардзейскіх эмігрантаў, якія вярнуліся з за кардону. Савецкі ўрад Беларусі ў свой час пазволіў вярнуцца з эміграцыі раду асоб дзякуючы іх запэўненьню сумленна працаваць на карысьць сацыялістычнага будаўніцтва. У рэчаістасьці гэтыя асобы скарыстаўшы з аказанага ім даверу—прадаўжалі сваю контр-рэвалюцыйную дзеяльнасьць у згодзе з зарубежнымі буржуазнымі і сацыял-фашыстоўскімі арганізацыямі і па іх указаўкам.

У ліку арыштаваных — быўшыя міністры: Ластоўскі, Цьвікевіч, Краскоўскі, Смоліч, а таксама Лёсік, Некрашэвіч і іншыя. Вядзецца сьледзтва“.

Цяпер ня можа быць ніякага сумліву у праўдзівасьці вестак пра арышты беларусоў. За праўдзівасьць іх рэдакцыя нашай газэты бярэць на сябе адказнасьць.

Да гр. Браніслава Тарашкевіча,

былога старшыні Ц. К. Беларускае Сял.-Раб. Грамады.

Адкрытае пісьмо.

У часе перадвыбарнае агітацыі камуністычная арганізацыя ў Зах. Беларусі закідала беларускія вёскі агітацыйнымі лістоўкамі, якія прадстаўляюць перапевы ранейшых камуністычных пракламацыяў, толькі цяпер падпісаны не партыяй, а прозьвішчам Браніслаў Тарашкевіч, з дадаткам на некаторых — „старшыня Грамады“.

Адозвы гэтыя зьмяшчаюць столькі бруду і агіды, столькі брутальнае лаянкі, што мы, ніжэйпадпісаныя, проці каго скіраваны адозвы, адмаўляемся верыць, каб нешта падобнае магло выйсьці з пад Вашага, гр. Тарашкевіч, пяра. „Банда Луцкевічаў, Астроўскіх, Акінчыцаў, Крукаў, Каралёў, Міцкевічаў“, „Патрыярхі беларускае здрады“, „правакатары і найзаядлейшыя пракуроры Грамады“, „пагромшчыкі ўсіх беларускіх культ.-прасьветных арганізацыяў“, „платныя шпікі польскай дэфэнзывы“, „разбойнікі, арганізуючыя напады на Беларускі Сял.-Раб. клюб „Змаганьне“, „грабары сацыяльна-нацыянальнага вызваленьня руху працоўных Зах. Беларусі“, „інквізытары беларускага вызвольнага руху“, „беларускія Азэфы“, „правакатары і пагромшчыкі“, „обэр-сышчыкі“ і гэтак далей—вось „букет“, які пакрашае скрозь гэтыя адозвы з Вашым подпісам.

Мы ня можам верыць, каб усё гэта пісалі Вы, бо-ж з усімі гэтымі людзьмі Вы аставаліся **ў цесным контакце і самых прыязных адносінах ня толькі ў часе існаваньня Грамады, але і ў часе супольнае бытнасьці з Луцкевічам, Астроўскім і Акінчыцам у вастрожных мурох і на лаве падсудных на працэсе Грамады, за якую мы супольна пакутавалі, і пасьля Вашага звальненьня з вастрогу — ажно да мамэнту выезду Вашага з Польшчы.** Вы пры адведзінах нас, робленых не ўкрадкам, а адкрыта і з агульнага ведама, вялі з намі шматгадзінныя гутаркі, у якіх разыходзіліся з намі ідэолёгічна, **але выяўлялі сваё поўнае даверье да нас асабіста.** Вы і і Вашыя таварышы з Ц.К. Грамады з учасьцем гр. гр. Рака-Міхайлоўскага, Бурсэвіча, Акінчыца і Астроўскага яшчэ ў ліпні с. г., абгаварываючы не „ўзрываньне“, а як раз абарону намі беларускіх культурна прасьветных арганізацыяў і ўстрою ад узрыву іх камуністычнай партыяй, **не маглі знайсьці ніводнага слова асудження нас за гэту абарону. І Вы шчыра і адкрыта гаварылі нам аб сваёй новай веры“**, дзеля якое Вы выходзіце з нашых радоў.

Усё гэта не пазваляе нам зарэагаваць на ўспомненыя выбарныя адозвы, як на „Вашыя“, пакуль мы не атрымаем **ад Вас беспасярэдна на пісьме сьцьвярджэньня Вашага аўтарства.** Мы разумеем што наш зварот да Вас можа паставіць Вас у прыкрае палажэньне, паскольку Вы мо' далі пэўным асобам ці пэўнай арганізацыі права падпісываць Вашае імя пад тымі ці іншымі палітычнымі энунцыяцамі, і зусім магчыма, што Вы дзеля гэтае прычыны моўчкі прымеце на сябе маральную адказнасьць за ілжу, бруд і агіду другіх. Але, ня гледзячы на гэта, мы робім спробу выявіць праўду, бо йшчэ ня згубілі веры ў сьветлыя бакі душы чалавечае, ня згубілі веры ў Чалавека і пашаны да Яго.

Чакаць Вашага адказу будзем да 1 студня 1931 г. Усякі іншы адказ, апрача беспасярэднага на пісьме, будзем лічыць не аўтэнтычным.

Дзеля таго, каб мець пэўнасьць, што гэтае нашае пісьмо будзе Вамі прачытана, пасылаем яго адначасна ў цэлы рад часопісаў.

Ант. Луцкевіч
Радаслаў Астроўскі
Фабіян Акінчыц
Кузьма Крук
Сымон Кароль

Вільня, 6 сьнежня 1930 г.

Пал. Аленса

* * *

Ты мой сьвет.
Ты мой сьвет.
  Мая надзея...
Слова беднага прадзеда:
  Сьвіне ярма ліхадзея,
Што праз доўгія сталецьця
  Несьлі лямку без прасьвецьця,
Ішлі на мукі ў паняверцы,
  Аддаваліся безнадзейна...
Але раптам прамень сонца,
  Беларускае старонца
Засьвяціўся, заіскрыўся,
  Над палямі, над лугамі,
Даўнай прошласьці дзірваны
  Рукой працаю ўзьдзіраны,
Каб на ім узрасьлі надзеі,
  Адчыніўшы шчасьцю дзьверы.
За пакуты, скрыжаваньні,
  За бізун і нараканьні,
Даці вольную свабоду
  Беларускаму народу!

Фальв. Манюшчыца
8 IX 930 г

Палітычнае жыцьцё.

Польшча.

Адстаўка габінэту Марш. Пілсудскага.

4 сьнежня г. г. габінэт Маршалка Пілсудскага падаўся у адстаўку.

У зьвязку з гэтым п. Прэзыдэнт Рэчыпаспалітай падпісаў дэкрэт, у якім вызначаны новы састаў міністраў.

Старшынёю Рады Міністраў назначаны Валеры Славак.

Ген. Славой Складкоўскага міністрам унутр. спраў, Аўгуста Залескага — міністрам спраў заграні́чных.

Марш. Язэпа Пілсудскага — міністрам вайсковых спраў.

Часлава Міхалоўскага — пракурора Варшаўскага Акр. Суда — міністрам Справядлівасьці.

Лявона Янта-Полчынскага — міністрам рольніцтва.

Аляксандра Прыстара міністрам промыслу і гандлю.

інж. Альфонса Кюна—міністрам камунікацыі.

Ген. Норвід-Неўгебаўэра — міністрам публічных прац.

Сьцяпана Губіцкага — міністрам працы і грамадзкай апекі.

праф. Лявона Казлоўскага — міністрам рэформаў рольных.

Ігната Бэрнэра — міністрам пошт.

Ігната Матушэўскага — кіраўніком міністэрства скарбу.

Як падаюць добра паінфармаваныя газэты зьмена габінэту не азначаець яшчэ зьмены агульнага курсу палітыкі ці то зьменамі ўраду, а ёсьць нічым іншым як „зьменаю варт“.

100 ўгодкі польскага паўстаньня.

29 і 30 лістапада ўва ўсей Польшчы сьвяткаваліся 100-я ўгодкі паўстаньня 1830 г.

Усюды адбыліся ўрачыстасьці з паходамі, лекцыямі і спэктаклямі, прысьвечанымі юбілею.

Выбары у Лідзкім вокрузе.

Згодна афіцыяльным дадзеным, апублікаваным праз Акружаую Выб. Камісію № 62, аканчальныя вынікі галасаваньня ў Лідзкім вокрузе прадстаўляюцца ў наступным відзе:

За № 22 (Бел. Цэнтрасаюз) пададзена ўсяго 3,487 галасоў, з якіх у паасобных паветах пададзена: у Лідзкім 228, у Шчучынскім—216, у Валожынскім — 703, у Вялейскім — 1,446, у Маладэчанскім—715, у Ашмянскім—161; усяго—3,487.

У папярэднім нумары нашае газэты мы падалі цыфру 2 338 галасоў, як паданых у Лідзкім вокрузе. Цяпер згодна аканчальных падлічэньняў, апублікаваных праз Выб. Камісію цыфра гэтая павялічылася, як бачым, больш як на 1000 галасоў.

Заграніцай.

Завастрэньне польска-нямецкіх адносінаў.

Нямецкія газэты пішуць, што падчае апошніх выбараў у В. Сілезіі (Górny Śląsk) былі беспарадкі, у выніку якіх аказалася шмат пашкадаваных немцаў.

Як перадаець ПАТ нямецкі генэральны консул В. Сілезіі прыбыў 25 лістапада ў Бэрлін і злажыў нямецкаму ўраду справаздачу аб выбарнай кампаніі ў польскай частцы В. Сілезіі.

У зьвязку з гэтым нямецкая прэса шмат увагі ўдзяляець гэтаму пытаньню, даводзячы, што ў гэтай справаздачы ёсьць шмат матэрыялу кампрамітуючага Польшу і дамагаецца, каб нямецкі ўрад злажыў жалабу ў Лігу Нацый.

Некаторыя газэты, як напр. „Boersen Ztg.“ прынялі пагражаючы тон і пішуць, што „цярплівасьць“ нямецкага народу скончылася і што „Ліга Нацыі панясе адказнасьць за тое, што можа здарыцца ў далейшым“.

Наагул уся нацыяналістычная нямецкая прэса стараецца падбурыць нямецкую агітацыю проці Польшчы, а асабліва проці Саюзу польскіх В.-Сілезскіх паўстанцаў, арганізаваўшы быццам падчас выбараў у В.-Сілезскі Сойм рад нападаў на нямецкую меншасьць.

Нямецкія газэты падаюць, быццам польскія паўстанцы ўрываліся ў намешканьне выбарных камісій і выкідалі адтуль усіх знаходзячыхся там немцаў, рабілі напады на прыватныя кватэры немцаў і навет забівалі іх. Нямецкі ўрад пастанавіў дамагацца ад Лігі Народаў, каб яна разглядзела гэтую справу на бліжэйшай сэсіі, якая адбудзецца 15 студзеня 1931 г.

На гэтай-жа сэсіі немцы будуць дамагацца, каб былі разгледжаны апрача таго і тыя непаразуменьні, якія здарыліся на Паморы.

У зьвязку з анты-польскаю атакаю, якую пачала нямецкая прэса — польскае міністэрства ўнутраных спраў выдала камунікат, у якім заяўляець, што парадак і спакой падчае выбараў у В. Сілезіі быў забясьпечаны польскаю ўладаю.

Выпадкі нарушэньня парадку былі аднатаваны толькі ў некалькіх пунктах, дзе выступалі самыя ярыя фанатыкі і агітатары. Парадак быў парушаны ў Бржэх, дзе былі пабіты тры немцы і ў Новай Вёсцы, дзе быў забіты польскі работнік Штэльмах. Улады прыступілі да расследаваньня ўсіх гэтых выпадкаў і ўсе віноўныя, па вестках камунікату, панясуць адпаведную кару.

Масавыя паўстаньні сялян у Пскоўскай вобласьці.

Як перадаюць латвійскія газэты, у Пскоўскай вобласьці, пераважна ў Опацкім, Астраўскім і Пскоўскім округох зноў успыхнулі масавыя сялянскія паўстаньні ў зьвязку з рэквізыцыямі хлеба і лёну.

26 лістапада разрушана праз артылерыю і спалена вёска Кожына. Іншыя вёскі таксама абстраляны артылерыйскім вагнём. Амаль усё дарослае насяленьне арыштуецца і высылаецца ў Сыбір. Вастрогі ў Востраве і Пскове перапоўнены сялянамі. Троіцкі манастыр (каля Вострава) пераробдены ў вастрог.

Паўстаньне мае арганізаваны характар і ўспыхаець адначасна ў некалькіх мясцох.

26 лістапада паўстаньне паднялося ў раёне места Опочкі, пагоста Грывы, паг. Усіклы і ў кірунку эстонска савецкай граніцы.

Чуваць была сільная артылерыйская стральба ў Пскоўскім раёне каля вёсак Лебанава, Хворастава і іншых.

Па Пецярбурскай шашы ў кірунку да латвійскай граніцы ўвесь час курсуюць 2 бранявікі. Ахарона савецка латвійскай граніцы ўзмоцвена.

У паўстанскіх раёнах сялянскае дабро разам з хатамі і хлявамі карныя атрады паляць.

Гэткія весткі перадаюць нам заграні́чныя газэты.

„Казлы адпушчэньня“ за радавую гаспадарку.

Новы працэс інжынераў-„шкоднікаў“.

У Маскве ідзе цяпер новы „паказальны працэс“ 8 сяброў так зван. „інжэнернага цэнтру“, ці „прамысловай партыі“. Яны вінавацяцца ў тым, быццам у паразуменьні з павадырамі „белай эміграцыі“ і францускай і англійскай буйнейшай буржуазіі—рыхтавалі правал гаспадарчага ўздыму СССР (так званай „пяцілеткі“)—каб, такім чынам аблягчыць „ваенную інтэрвэнцыю“, ці прасьцей, вайну імпэрыялістычных дзяржаваў проці работніцка-сялянскага Саюзу... Хаця самі падсудныя на судзе „прызнаваліся“ ўва ўсіх гэтых праступленьнях, расказываючы аб сваіх „адносінах“ у 1927—1929 г. г. навет з тымі павадырамі эміграцыі і буржуазіі, якія памерлі у 1922 — 1924 г. г., але з усяго відаць, што працэс „сфабрыкаваны“ якраз для таго, каб адвесьці гнеў народу ад запраўдных віноўнікаў гэтага правалу „пяцілеткі“—Сталіна і яго кумпанаў — ды скіраваць гэты гнеў на бязвінныя галовы шчырых працаўнікоў тэхнічнага пэрсаналу, якім пагражае кара сьмерці.

Гутаркі аб „разбраеньні“, а фактычна — новыя збраеньні.

Як ведама, у Жэнэве ўсьцяж „працуе“ канфэрэнцыя ў справе „разбраеньня“. Ніякіх практычных рэзультатаў канфэрэнцыя гэтая дагэтуль не дала. Нямеччына таму толькі чакае фармальнага правалу гэтай канфэрэнцыі, каб заявіць аб сваім праве так сама вольна і самастойна вырашаць справы свае дзяржаўнай абароны, як гэта робяць усе іншыя вялікія дзяржавы...

Такім чынам, замест зьмяншэньня збраеньняў“ ізноў пачне даваенная канкурэнцыя на выпярэдкі ў іх павялічэньні...

Дык характэрна, што ўжо цяпер — у часе „працы“ жэнэўскай „разбраенчай канфэрэнцыі“ **францускі ўрад унёс у палату праект новых крэдытаў у мільярд франкаў—на ўсіленьні дзяржаўнай абароны...**

Дзе-ж дзіўна спадзявацца „разбраеньня“, калі Нямеччына выразна трэбуе перагляду яе ўсходняй граніцы (з Польшчай), а Італія яўна рыхтуецца да вайны з Францыяй...

„Саюз“ Нямеччыны, СССР, Італіі і інш.

Вялізарную сэнсацыю выклікала спатканьне радавага камісара замежных спраў, Літвінава з італьянскім міністрам Грандзі. На спатканьне Літвінаў выехаў у Мілан, кінуўшы „разбраенчую“ канфэрэнцыю ў Жэнэве. Камунікат аб спатканьні двух дыплёматаў — чырвонага — камуністычнага і чорнага—фашыстаўскага—кажа аб тым, што „у ваўсіх справах, якія яны абгаварывалі, яны дайшлі да поўнай згоды і паразуменьня“!... Газэты пішуць, што падрыхтоўваецца магутны блёк дзяржаваў, злажаны з СССР, Італіі, Нямеччыны, Баўгарыі, Вэнгрыі і Турцыі, які паставіў сабе мэтай дабіцца перагляду трактату, перагляду граніцаў дый скасаваньня цяперашняй дыктатуры Францыі ў Эўропе. Блёку быццам „абяцае“ Англія спагадны нэўтралітэт...

Пара прыступіць да выдаваньня літэрат.-навуковага часопісу.

Як ні цяжкое наша палажэньне, усё-ж такі, як нам здаецца, мо ў сілах было-б выдаваць літэратурна-навуковы часопіс і забясьпечыць яго існаваньне.

Мы маем сваіх паэтаў, пісьменьнікаў і некалькі навуковых сілаў, якія працуюць у розных галінах мастацтва і навукі і якія з ахвотаю зьмяшчалі б свае творы ў беларускім часопісу.

Трудна спадзявацца, каб такі часопіс адразу з першага нумару апраўдаў расходы, калі яго друкаваць звычайным друкарскім спосабам і ў неакрэсьленай колькасьці, разьлічанай на будучых платных падпішчыкаў.

Нам здаецца, што цяпер трэба радыкальна парваць з тымі спосабамі, якія практыкаваліся раней пры выдаваньні рожных беларускіх часопісаў. На нашу думку трэба распачаць справу ад малога.

Трэба, каб самі грамадзяне, якія жадаюць выхаду такога часопісу, адгукнуліся з нашых вёсак і мястэчак і дэкляравалі, што яны будуць сталымі яго падпішчыкамі, абазначыўшы адначасна, якую суму грошаў яны маглі-б патраціць у год на падпісную плату.

Сабраўшы гэтыя дадзеныя, ініцыятыўная група ў Вільні магла-б уложыць бюджэт.

Калі б аказалася, што падпісная плата дасьць ня вельмі многа матэр'яльных сродкаў, тагды можна было-б часопіс друкаваць танейшым спосабам: напрыклад не ў друкарні, а адбіваць яго на павелячы і г. д.

Адным словам, на нашу думку ёсьць магчымасьць выдаваць такі часопіс — трэба толькі, каб самае грамадзянства адгукнулася на наш заклік і прыслала ў рэдакцыю нашай газэты адпаведныя заявы.

За Вільняю справа стаяць ня будзе: знойдзем тут і патрэбныя літэратурныя сілы і тэхнічных працаўнікоў, якія памогуць нашай справе.

Кароткія навіны.

Як падаець „Наше Время" „Реввоенсовет" на чале з Варашылавым пастанавіў прыступіць да ўзмацненьня савецкай граніцы на беларуска-польскім вучастку.

З гэтаю мэтаю ў раён Менску перакінуты тэхнічныя войскі з фінляндзкай граніцы. У гэты-ж раён сьцягнены артылерыйскія, кавалерыйскія і пяхотныя часьці.

Галоўная Рада Нямецкай Народнай Партыі прыняла аднагалосна рэзалюцыю, у якой дамагаецца рэвізыі нямецкіх усходніх граніцаў.

У Англіі пачалася забастоўка вуглякопаў. Б ступець 100.000 рабочых. Палажэньне ў ангельскай вугальнай прамысловасьці настолькі сур'ёзнае, што можа закончыцца выхадам у адстаўку габінэту Макданальда.

У зьвязку з інцыдэнтамі, якія былі падчас выбараў на польскім Горным Сьлёнску — нямецкі ўрад абгаварваў пытаньне аб тым — ці ёсьць магчымасьць на падставе маючыхся ў яго матэрыялаў аб выбарах склікаць надзвычайную Сэсію Лігі Нацыяў.

26 лістапада г. г. ў Японіі быў вялікі землятрус, у выніку якога налічваецца 243 забітых і больш як 1000 чалавек раненых.

Места Місхама разрушана зусім.

Асабліва сільна адчуваўся землятрус у вокрузе Шыжуока ў 100 кілёмэтрах ад сталіцы Японіі — Токіо.

На востраве Ява ажыў вулкан Мерапі і 23 лістапада пачаў выкідаць лаву. Падчас выбуху вулкана чуваць было сільны падземны гул.

Як падаюць амэрыканскія газэты, у хуткім часе маець быць унесяны ў амэрыканскі Кангрэс праект аб забароне эміграцыі ў Зл. Штаты П. Амэрыкі на 2 гады, пачынаючы ад 1 чэрвеня 1931 г.

Унясеньне гэтага праекту знаходзіцца ў зьвязку з безрабоцьцем на рынку працы.

Курс савецкай валюты няўпынна падаець. У Варшаве за 1 чырвонец плацяць 4 зл. 55 гр.

У Англіі спыніўся дысконт савецкіх вэксалёў, як ангельскімі банкамі, так і прыватнымі фірмамі.

Савецкія газэты падаюць, што ўзноў выкрыта нелегальная партыя пад назовам: „сялянска-работніцкая". Рыкаў і іншыя лідэры правай апазыцыі абвінавачваюцца ў тым, што прыймалі ўдзел у арганізацыі гэтай партыі.

Значная частка Галяндыі прадстаўляе з сабе мора, дзякуючы разьліву рэк і нябываламу навадненьню.

Каля гарадоў Ніімвеген і Кюік вада прыбываець па 3 сантымэтры на гадзіну, награжаючы ім поўным зьнішчажэньнем.

Усе дазволы, якія былі выданы на ўвоз савецкіх тавараў у Паўночную Амэрыку — затрыманы. Ад усіх імпортэраў вымагаецца цяпер, каб яны прадставілі доказ таго, што тавар не савецкага паходжаньня.

Урачыстае сьвяткаваньне 10-х угодкаў заснаваньня Белар. Студэнскага Саюзу.

Дня 23 лістапада адбылося ўрачыстае сьвяткаваньне 10-ых угодкаў заснаваньня Беларускага Студэнскага Саюзу ў Вільні, зладжанае вельмі ўмела і салідна. Сьвяткаваньне распачалося ўрачыстай акадэміяй у салі віленскага унівэрсытэту (Сьнядэцкіх), а г. 11. За прэзыдыяльным сталом заселі: прадстаўнікі цяперашняга ўраду Саюзу: К. Глінскі, Ст. Станкевіч, А. Бартуль, куратар саюзу—праф. Ст. Владычка; старшыня „АБСА"—інж. А. Лаўскі і былыя старшыні Саюзу: судзьдзя А. Зянюк, д-р Б. Туронак, д-р Б. Грабінскі, магістар права—М. Шкалёнак, А. Абрамовіч і М. Тулейка. Перад вялікім лікам прысутных у пекна ўдэкараванай беларускім гэрбам—Пагоняю, нацыянальнымі сьцягамі і зеленьню салі, старшыня Саюзу — К. Глінскі ў кароткіх словах адчыніў акадэмію, вітаючы ўнівэрсытэцкія і сьвецкія ўлады, а так-жа ўсё грамадзянства. Пасьля гэтага хор пад кіраўніцтвам А. Валынчыка прапеў традыцыйны студэнскі гымн „Gaudeamus", гымн, які чароўнай мэлёдыяй парываў за сабой усіх слухачоў.

Пасьля гэтага рэктар Віленскага унівэрсытэту праф. А. Яцушкевіч прывітаў акадэмію, жадаючы беларускаму студэнству пасьпеху ў ягонай працы.

Потым згодна з праграмай адбыўся пекны па форме і глыбокі па зьместу рэфэрат Ст. Станкевіча на тэму: „Гісторыя беларускага студэнскага руху", у якім прэлегент даў выстарчаючы агляд беларускай студэнскай дзейнасьці ўва ўсіх фазах яе разьвіцьця і падкрэсьліў бескампрамісную барацьбу беларускага студэнства за дзяржаўныя беларускія ідэалы. Гэты рэфэрат дакладна паказаў ідэолёгічнае аблічча нашага студэнства, якое заўсёды стаіць на вышыні сваіх заданьняў.

Пасьля гэтага таксама адбыўся цікавы рэфэрат А. Бартуля на тэму „Беларускі Студэнскі Саюз за 10 год існаваньня".

Па рэфэратах адбыліся прывітаньні прадстаўнікоў розных арганізацыяў і ўстановаў. Віталі: гр. А. Луцкевіч ад Бел. Навуковага Т-ва, кс. В. Гадлеўскі—ад Бел. Інст. Гасп. і Культуры, гр. А. Трэпка—ад Беларускага Цэнтрасаюзу, інж. В. Лаўскі — ад „АБСА", прадстаўнікі студэнскае моладзі украінскай, літоўскай, а так-жа ад Польскага краёвага студэнства, гр. Я. Найдзюк — ад „Шляху Моладзі" і многа іншых.

Апрача прывітаньняў вусных, былі адчытаны прывітальныя тэлеграмы і лісты ад розных асоб і арганізацыяў правінцыянальных і загранічных, а між іншым, ад многіх украінскіх студэнскіх арганізацыяў ад Цэнтральнага Саюзу Украінскага Студэнства ў Львове, ад Цэнтралі Нямецкага Студэнства ў Бэрліне, ад Беларускага Студэнства ў Рызе, Бэлгіі, Варшаве, Рыме і Чэхаславаччыне, ад Беларускіх установаў у Празе, Дзьвінску, Рызе і Навагрудку, ад бел. арганізацыяў у Амэрыцы, ад многіх беларускіх ксяндзоў і іншых паасобных грамадзкіх адзінак.

Падчас акадэміі на калідоры салі Сьнядэцкіх была наладжана выстаўка беларускае студэнскае прэсы. Вялікі лік экспонатаў на выстаўцы сьведчыў аб тым, што нашае студэнства, паміма цяжкіх умоваў жыцьця, усё ж такі жыве і працуе, працуе ўсюды і заўсёды панад меру сваіх сілаў. Таксама апошні нумар „Студэнскае Думкі" прысьвечаны гэтаму юбілею, выданы на добрай паперы, у пекнай вокладцы і ў вялікім разьмеры, зьмяшчае ў сабе многа багатага матэр'ялу, які сьведчыць аб шырокай, проста калясальнай на сяньняшнія варункі працы беларускага студэнства.

Далейшым пунктам праграмы сьвяткаваньня быў багаты канцэрт-баль у салі „Apollo". З пасярод багатага артыстычнага матэр'ялу канцэрту на асаблівую ўвагу заслугоўваў хор пад кіраўніцтвам А. Валынчыка, рэгента пры Беларускай Гімназіі ў Навагрудку, які спэцыяльна на пару тыдняў прыехаў у Вільню і прыгатаваў за гэты час вельмі добры хор.

Перад распачацьцем канцэрту яшчэ адбыліся прывітаньні ад тых, якія падчас акадэміі зрабіць гэтага не маглі, між іншым, ад прадстаўнікоў жыдоўскага студэнства.

Канчаючы гэты кароткі агляд трэба зазначыць, што гэтае сьвяткаваньне, дзякуючы працы і стараньнем нашага студэнства, было найлепшым з усіх тых якія беларускім грамадзянствам за пару апошніх год былі ладжаны. А будучае якбы паддікам працы за мінулых 10 год, выразна паказала, што нашае студэнства, увайшоўшы ў наступную фазу свайго разьвіцьця таксама апраўдае ўскладаныя на яго надзеі. У гэтым і сэнс працы нашае студэнскае моладзі, наступаючай гэнэрацыі беларускага грамамадзянства.

Аглядчык.

Абвешчана новае распараджэньне савецкага ўраду, аб ліквідацыі ўсіх кооператываў, саюзаў і „колхозаў", у склад якіх уваходзяць „кулакі" і асобы, ня маючыя выбарных правоў.

У Канадзе ўрад выдаў распараджэньне аб высылцы ўсіх нежанатых эўрапейцаў, ня маючых работы.

Улады ўжо выселілі каля 300 безработных, адправіўшы іх на бацькаўшчыну.

Прэсавы ланцуг.

Яшчэ раз заклікаю беларускае грамадзянства да ахвярнасьці на пашырэньне нашай прэсы.

Трэба раз на заўсёды пакончыць з нашым нядбальствам адносна сваей газэты і рэгулярна ўносіць падпісную плату.

У наступным нумары газэты буду паіменна выклікаць віленскіх грамадзян, каб падтрымоўвалі газэту.

Якуб Сідаровіч.

Ад Рэдакцыі. На заклік гр. Якуба Сідаровіча ўжо адазваліся найбольш сьведамыя грамадзяне, якія прыслалі падпісную плату і пасільныя ахвяры. Трэба каб усё нашае грамадзянства паступала так, як ніжэйпададзеныя асобы.

Атрымана ў зьвязку з заклікам гр. Я. Сідаровіча, ад:

1) Кастуся Паўтрукевіча, Баранавіцкага павету — 3 зл.
2) Пятра Бандарэвіча, Баранавіцкага павету — 3 зл.
3) Яна Кустановіча, Вялейскага пав. — 1 зл.
4) Ул. Міхасёнка, Браслаўскага пав. — 2 зл.
5) Чэслава Ханяўкі з Будслава — 3 зл.
6) Язэпа Грышкевіча з Будслава — 3 зл.
7) Пятра Трыпуцько з Будслава—2 зл. 50 гр.

Хроніка.

× **Новая кніга.** У Празе выйшла з друку кніга пад назовам „Belorus a Belorusove" (Беларусь і Беларусы) напісана д-рам Мік. Ільяшэвічам. Кніга мае 128 старонак, 13 ілюстр. і карту этнографічнае Беларусі. Аўтар інфармуе чэскае грамадзянства аб Беларусі і Беларусох вельмі ўдала і ўсебакова. Крытычны агляд дамо асобна.

× **Беларусы ў Чэхаславаччыне.** У суботу 22-го лістапада г. г. адбыўся ў Празе гадавы сход сяброў Беларускае Рады ў Празе, на якім пасьля абгаварываньня цэлага шэрагу пытаньняў арганізацыйнага характару быў выбраны наступны ўрад: старшыня—М. Вяршынін, віцэстаршыня — А. Калоша, сэкрэтар—М. Вітушка. У рэвізыйную камісію абраны: П. Астапкевіч, Ян Сак і Л. Гірыс.

У справе ўпарадкаваньня архіву выбрана спэцыяльная камісія.

× **Справа праваслаўнай духоўнай сэмінарыі.** Як падаюць польскія газэты, напр. „Dz. Wil." справы ў Віленскай Духоўнай Сэмінарыі стаяць ня зусім добра.

Беларускі Царкоўны Камітэт зьвярнуў на гэта ўвагу і паслаў да адпаведных уладаў абшырны матэрыял, у якім даносіць а папоўненых надужыцьцях у інтэрнацкай гаспадарцы гэтай сэмінарыі.

Аўтары мэмарыялу дамагаюцца, каб была праведзена міністэрыяльная рэвізыя ў інтэрнаце з адначаснаю адстаўкаю рэктара сэмінарыі. У канцы мэмарыялу знаходзяцца рэвэляцыйныя дадзеныя а парадках, пануючых у інтэрнаце.

З усяго гэтага відаць, што беларускаму грамадзянству варта было-б бліжэй зацікавіцца царкоўнымі і царкоўна-асьветнымі справамі, якія кіруюцца чамусьці людзьмі, нічога не маючымі супольнага з беларускаю грамадзкасьцю ня гледзячы на тое, што беларусы зьяўляюцца ў нашых парахвіях асноўною масаю парахвіян.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны гр. Рэдактар.

„Беларуская Крыніца" № 30 з дня 9. 10. 30 і яе выбарны заступнік „Беларускі Кліч", павялі процiў б. пасла Юхневіча і мяне некультурна-злосную кампанію. Ня маючы ніякіх аргумэнтаў на абвінавачаньне, успомненыя газэты хапіліся за вульгарную лаянку і ілжу толькі затое, што Юхневіч і я скарысталі з свайго грамадзкага права быць выбранымі ў Сойм. Спадзяючыся, што гр. Юхневіч процiў гэтых напасьцяў выступіць асобна, прашу не адмовіцца ў імя праўды зьмясьціць наступнае выясьненьне, хоць я, з прычыны майго неналежаньня да Вашага, гр. Рэдактар, палітычнага лагеру, — быў і магчыма, буду атакаваны і з боку „Нар. Звону".

Непаразуменьні між мной і неафіцыяльнымі лідэрамі беларускай хадэцыі пачаліся з таго часу, калі апошнія, не вядучы абсалютна ніякай позытыўнай працы ў партыі, перасталі прызнаваць уладу Цэнтральнага Камітэту БХД. Да якой меры успомненыя безадказныя дзейнікі ігнаравалі Цэнтральны Камітэт, даволі будзе прыпомніць, як сёлета на перавыбарах у Сойм у Сьвянцянскім вокрузе быў імі самазвана, бяз ведама і згоды партыйных уладаў, запраектаваны сьпісак кандыдатаў, зрываючы блёк з іншымі нацыянальнымі меншасьцямі. На гэтым сьпіску першым кандыдатам стаяў Я. Пазьняк, другім, нейкі, нікому няведамы, Зімніцкі. Калі на пасяджаньнях Бел. Нацыянальнага Камітэту, пры падтрыманьні сяброў пасольскага Клюбу, мне ўдалося абараніць концэпцыю Блёку Нацыянальных Меншасьцяў з даўнейшымі кандыдатамі, — з боку галоўных правадыроў бел. хадэцыі, міма агульнай згоды з пастановай Нац. Камітэту, пачаўся сабатаж выбараў. У той час, як я з калегамі вёў агітацыю на вёс

цы, „Бел. Крыніца“, якой я быў выдаўцом і лажыў на яе ўласныя кошты, — зусім неспадзявана выступіла процiў сваіх-жа кандыдатаў і св йго выдаўца.

Калі пачаліся падгатоўкі да апошніх выбараў у Сойм і Сэнат, развал у партыі яшчэ больш паглыбіўся. Мае выступленьні процiў дыктатарскіх парадкаў неўспадабаліся „непамыльным“ аванімным „суверэнам“. Тады яны робяць націск на Цэнтральны Камітэт партыі, каб той забараніў мне кандыдаваць у Сойм. І запраўды была ўнесена нічым неўматываваная пастанова ЦК, каб я на выбары ня йшоў. Такая пастанова была патрэбна перадусім паслу Ярэмічу, які заняўшы на дзяржаўным спіску № 11 пэўнае месца, дамагаўся яшчэ заняць першыя мясцы і на акруговых спісках. Трэба дабавіць, што Ярэміч дэлегаваны выбарнай Камісіяй, зложанай пераважна з 6 паслоў, выключна на перагаворы адносна блёку з Украінцамі, бяз ведама і згоды ўспомненай Камісіі і Нац. Камітэту, паставіў сябе на дзяржаўную лісту № 11. Не памаглі пратэсты процiў нацужыцьця даверу сваіх калегаў. Запраўдныя кіраўнікі бел хадэцыі, зьвязаныя з Ярэмічам ня стольки ідэолёгіей, колькі гандлёва-прамысловымі прадпрыемствамі, ахвотна яму ўсё „разгрэшалі“, бо праўдападобна самі Ярэміча інспіравалі на такія гешэфты,

Бачучы ўсюды бясправуе, фальш і дэмаралізацыю, я ня раз прапанаваў правадыром БХД грунтоўна рэарганізавацца, тымбольш, што ведамы загад арп. Ялбжыкоўскага адносна БХД, аканчальна паралiжуе дзейнасьць партыі а ідэолёгія бел. хадэцыі, паводле маей думкі, таксама вымагае поўнага перагляду. Калі мае рэарганізацыйныя пляны не маглі зрэалізавацца, я лічыў неабходным зьняць з сябе адказнасьць за далейшы развал у партыі і 5. Х. з яе вышаў. Незабаўна я разам з Юхневічам заявілі Бел. Нацыянальнаму Камітэту, што скарыстаем з свайго грамадзкага права быць выбiранымі ў Сойм і каб не разбіваць беларускіх галасоў, запрапанавалі дагаварыцца з намі, як стараной, адносна выбараў. **На нашу прапазыцыю ня было адказу.** З „Цэнтрасаюзам“ п. Ярэміч з Пазьняком перагаворы сарвалі. **Ясна з гэтага, хто нясе адказнасьць за тое, што пашлі беларусы на выбары некалькімі спіскамі і ня выбралі ані аднаго пасла ні сэнатара.**

Калі пачалася выбарная барацьба, белар. хадэкі паказалі сваё запраўднае маральнае абліччa. Яны няпрыстойна і беспадстаўна напалі на Юхневіча і мяне ў „Бел. Клічу“ і прымусілі Сьвянцянскі Выбарны Камітэт спіску № 24 рэагаваць у адозве. Але яшчэ раней, бо 8. Х. б. г. адказны рэдактар „Б. Крыніцы“ Я. Пазьняк і студэнт Я. Шутовіч прасілі мяне, як выдаўца ўспомненай газэты, пераўступіць выдаўніцтва „Бел. Крыніцы“ на імя Шутовіча. Зразумелая рэч, што аддаваць аружжа ў рукі маіх палітычных праціўнікаў на выбары мне было дужа нявыгадна і я меў поўнае права аставіць газэту за сабой. Ня хочучы, аднак, карыстаць з хадэцкай фірмы на выбарах, а такжа дзеля лішняй грызьні, я дабравольна і бязінтэрэсоўна газэту ўступіў Шутовічу з умовай, каб „Бел. Крыніца“ ня выступала процiў мяне. Прысутны пры гэтай умове галоўны і найбольш „хрысьціянскі“ правадыр БХД распінаўся, што аб **недатрыманьні гоноровага слова і гутаркі быць ня можа.** На маё дамаганьне было навет выдана пісьменнае забавязаньне. Вось яго даслоўная копія (арыгінал у мяне на руках):

Да гр. А. Стэповіча ў Вільні.

Гэтым заяўляем, што ў „Белар. Крыніцы“ ніякіх выступленьняў процiў гр. А Стэповіча друкаваць ня будзем.

(—) Янка Шутовіч.

8. 10. 1930 г. **(—) Я. Пазьняк.**

Ня гледзячы на гэта гоноровае забавязаньне з подпісам выдаўца і рэдактара „Бел Крыніца“ зьмясьціла цэлы рад напасьцяў і беспадстаўных закідаў па маім адрэсе Такім чынам кіраўніцтва БХД прыкрываючыся плашчом хрысьціянства паказала сваю поўную моральную руіну. Гэты, прыведзены вышэй, дакумэнт ганьбы, кампрамітуе ня толькі таго, хто відаць падпісаны пад ім, але і тых безадказных і нясумленных адзінак, якія ў нізкіх мэтах выкарыстоўваюць бязумоўна ад сябе залежных людзей, адбіраючы ад іх грамадзкую чэсьць. Хай-жа наша грамадзянства ведае, да чаго зводзіцца „праца“ лідэраў бел. хадэцыі!

На закіды „Б. Крыніцы“ і „Б. Клічу“, быццам я як пасол нічога не рабіў, адкажу каротка: цудаў не рабіў, але магу даць дзесяткі довадаў, што працаваў ня менш і ня з горшым скуткам, чымся іншыя паслы клерыкальна ярэмічаўскага лагеру.

Можа-б пасьля галаслоўных закідаў адносна маей працы „Б. Крыніца“ захацела задаць сабе труд адказаць на пытаньне: калі і дзе выказалі асаблівую працавітасьць недасягнены ідэал цяперашняй „Крыніцы“ — Ярэміч і Ко, будучы пасламі? Ці-ж трэба яшчэ каму даказаць, што гэтыя людзі выбраныя ў Сойм у 1922 г. і маючы куды лепшыя ў той час варункі да працы на вёсцы, ны мелі з ей праз 5 гадоў сувязі, як ня маюць і цяпер?

Адносна скіраванага да мяне вульгарнага закіду аб імкненьні да „карыта“, катэгарычна мушу сьцвердзіць, што найменш аб гэтым маюць права гаварыць правадыры клерыкальна-ярэмічаўскай коаліцыі. Беларускае грамадзянства нядрэнна ведае хто ў нас вышаў з Сойму такім як увайшоў, а хто і як рабіў кар'еру. Буду спадзявацца, што „Б Крыніца“ новымі напасьцямі ня будзе мяне прымушаць гаварыць аб гэтым больш па драбязна. Буду такжа спадзявацца, што дзеячы з „Крыніцы“ ўрэшце зразумеюць, што газэта нашаму народу патрэбна дзеля нацыянальнага ўсьведамленьня і асьветы, а ня дзеля таго, каб з яе шпальтаў расплывалася зараза грызьні і развалу на ўсю заходнюю часьць нашай няшчаснай бацькаўшчыны.

Альбін Стэповіч
б. пасол Сойму.

Вільня 7 сьнежня 1930 г

Паштовая скрынка.

У „Цэнтрасаюз“ надыходзяць запытаньні ад паасобных гурткоў Таварыства Беларускай Школы пра тое, што рабіць у зьвязку з ліквідацыяю Галоўнае Управы і фактычным паралiжам дзейнасьці Т. Б. Ш.

На ўсе гэтыя пытаньні можна даць толькі параду, каб усе гурткі і паасобныя сябры Т, Б. Ш., якія хацелі-бы весьці і надалей культурна асьветную працу дамагаліся перад уладамі аб склiканьні Агульнага Зьезду сяброў Т. Б. Ш.

Усе гэтыя дамаганьні можна кіраваць у Цэнтрасаюз які са свайго боку пачыніў-бы пэўныя крокі перад уладамі ў межах выклапатаньня дазволу на Зьезд, які змог-бы ажывіць дзейнасьць гэтага Таварыства.

У рэдакцыю паступілі шмат лістоў з просьбаю, каб высылалася наша газэта. Гэтым паведамляем, што газэта можа высылацца толькі тым грамадзянам, якія ўнесьлі належную аплату.

Усячына.

Гісторыя ўжываньня гарбаты.

Найстарэйшыя гістарычныя крыніцы паказваюць нам на паходжаньне гарбаты з Кітаю.

Кітайская мэдыцына за старых часоў рэкамандавала яе як лякарскі сродак.

Што датычыць да пачаткаў штодзеннага ўжываньня гарбаты, то мы маем толькі легэндарныя даданьня.

Першабытнае ўжываньне гарбаты было вельмі прымітыўнае.

Зялёныя лісты гарбаты сушылі і таўклі, а потым мясілі іх як цеста, якое разам з рознымі прыправамі варылі на густы адвар.

Пазьней, за часоў дынастыі Суне (960—1127 г. па Н Х.) малолі гарбату на парашок, які і варылі з вадою

Толькі ў 13 веку пачалі ўжываць гарбату ў такі спосаб у які цяпер ужываюць яе па ўсім сьвеце.

У Індыі і на Цэйлоне, у найпаважнейшых цэнтрах гарбатных плянтацый культываваньне яе пачынаецца з канца 18 веку, калі гэтыя землі былі захопленыя эўрапэйцамі. Культываваньне на Яве бярэць свой пачатак з Японіі.

У навейшыя часы заведзена культываваньне гарбаты і ў іншых мясцох зямной кулі, як напрыклад у Аўстраліі, на Каўказе, Бразыліі і інш.

У Эўропу першы раз прывязлі гарбату галяндцы ў 1610 годзе, з Галяндыі яна пранікла ў Англію, потым у Францыю і Нямеччыну.

У Расею гарбата пранікла ў 1638 годзе праз Манголію.

У 1885 годзе лік людзей, якія ўжывалі гарбату, асягнуў 500 мільёнаў чалавек.

Адказны Рэдактар: К. Крук. Друкарня Я. ЛЕВІНА Вільня, Нямецкая 22. Выдавец: „Беларускі Цэнтрасаюз“.